КАЛЯНДАР СТРЫЖАК НА САКАВІК

1 сакавіка, пятніца. У гэтым дні адсутнічаюць як станоўчыя, так і адмоўныя матывы, дзейнічайце ў адпаведнасці з задуманым, і няхай вам спадарожнічае поспех.

2 сакавіка, субота. Добры дзень для новай і смелай стрыжкі, аб якой вы даўно марылі.

3 сакавіка, нядзеля. Стрыжка будзе ўдалай, і яе ўздзеянне палепшыць вашы адносіны з навакольнымі і начальствам.

4 сакавіка, панядзелак. Дзень падыходзіць для нязначных змен у даўжыні, але кардынальныя змены лепш адкласці на іншы перыяд.

5 сакавіка, аўторак. Спрыяльны дзень для таго, каб рабіць складаныя стрыжкі: форма будзе трымацца доўга.

6 сакавіка, серада. Вельмі супярэчлівы дзень для любых маніпуляцый з валасамі, стрыжыцеся толькі калі гатовыя да сюрпрызаў. Новая прычоска можа як парадаваць, так і засмуціць вас.

7 сакавіка, чацвер. Стрыжка і колер валасоў павінны быць камфортнымі перш за ўсё для вас. Хацелі зрабіць асіметрычную стрыжку? Запішыцеся да цырульніка.

8 сакавіка, пятніца. Нейтральны дзень для новай прычоскі, але можна зрабіць і звычайную для вас стрыжку.

9 сакавіка, субота. Не час для любых маніпуляцый з валасамі. Варта ўстрымлівацца нават ад мыцця валасоў.

10 сакавіка, нядзеля. Не рэкамендуецца праводзіць стрыжку і афарбоўванне валасоў у гэты дзень, таму што вынік можа вас не задаволіць.

11 сакавіка, панядзелак. Стрыжка і афарбоўванне валасоў не рэкамендуюцца.

12 сакавіка, аўторак. Стрыжка валасоў у гэты дзень можа пагоршыць памяць, прывесці вас у збянтэжаны стан, пагоршыць эмацыянальны фон.

13 сакавіка, серада. Цяпер выдатны перыяд для любых маніпуляцый з валасамі, смела ідзіце ў салон.

14 сакавіка, чацвер. Сёння цудоўны дзень для наведвання цырульніка.

15 сакавіка, пятніца. Добры перыяд для змены прычоскі, падыдзе дзень і для тых, хто жадае абнавіць вобраз.

16 сакавіка, субота. Добры дзень для стрыжкі валасоў. Робім чубок для прыцягнення энергіі Ветру, якая, у сваю чаргу, прынясе вам тыя змены, якія зараз неабходныя.

17 сакавіка, нядзеля. Стрыжка і афарбоўка валасоў непажаданыя, бо ў наступным месяцавым перыядзе могуць узнікнуць фінансавыя і камунікатыўныя праблемы.

18 сакавіка, панядзелак. Лепш адкласці візіт у салон, а таксама ўсе маніпуляцыі з валасамі.

19 сакавіка, аўторак. Пазітыўны дзень. Ніякіх лёсавызначальных змен не нясе, але стрыжка ці ўкладка атрымаецца на здзіўленне ўдала і будзе радаваць ваша вока, што прывядзе да ўзрушальна-добрага настрою.

20 сакавіка, серада. Хоць стрыжка атрымаецца далёкая ад дасканаласці, але можаце падабраць ідэальнае адценне, выкарыстоўваючы любімыя колеры.

21 сакавіка, чацвер. Выдатны час для новай прычоскі, валасы будуць добра расці, стрыжка атрымаецца ўдалай.

22 сакавіка, пятніца. Цудоўны час для наведвання салона прыгажосці працягваецца, будуць удалымі як новая стрыжка, так і тая, якую вы робіце ўвесь час.

23 сакавіка, субота. Сёння — выдатны дзень для змены іміджу і стварэння новага вобраза.

24 сакавіка, нядзеля. Новая стрыжка захавае сваю форму і парадуе доўгі час, але важна заставацца верным свайму майстру, каб пазбегнуць расчараванняў.

25 сакавіка, панядзелак. Калі не хочаш, каб у тваім жыцці з'явіліся залішнія стрэсы і павышаная нервовасць, то ад стрыжкі і афарбоўкі валасоў у гэты дзень лепш адмовіцца.

26 сакавіка, аўторак. Вельмі добры перыяд для любой стрыжкі. Валасы стануць больш моцнымі і бліскучымі, прычоска дадасць вашаму вобразу лёгкасці і рамантычнасці.

27 сакавіка, серада. Нейтральны дзень для наведвання салона прыгажосці. Стрыжка не прынясе ярка выяўленага эфекту і радасці.

28 сакавіка, чацвер. Стрыжка можа мець непрадказальныя негатыўныя наступствы, валасы стануць больш тонкімі і непаслухмянымі.

29 сакавіка, пятніца. Дзень спрыяльны для абнаўлення прычоскі, якая станоўча адаб'ецца на вашых зносінах з блізкімі. Нават невялікае падстрыганне кончыкаў валасоў надасць здароўя вашай шавялюры.

30 сакавіка, субота. Класічныя мадэлі стрыжак сёння не папулярныя, выключны час для аматараў эксперыментальных варыянтаў.

31 сакавіка, нядзеля. Спрыяльны перыяд для абнаўлення прычоскі і прыўнясення свежасці ў ваш вобраз. Падстрыжыцеся сёння, і поспех не прымусіць сябе доўга чакаць.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.57	18.43	10.46
Віцебск —	7.49	18.35	10.46
Магілёў —	7.47	18.37	10.50
Гомель —	7.42	18.36	10.54
Гродна —	8.12	19.03	10.51
Брэст —	8.10	19.06	10.56

Месяц

Поўня 24 лютага. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Данілы, Ільі, Паўла, Самуіла.*
К. *Антаніны, Фелікса.*

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ЗАЎТРА



1 САКАВІКА Даты Падзеі Людзі

У краіне

1684 год — нарадзіўся Ян Антоній Пашакоўскі, педагог, выдавец, гісторык, доктар філасофіі. У 1714—1715 гадах выкладаў у Ковенскай гімназіі паэтыку і рыторыку, у 1717-м — яе дырэктар. Пасля трохгадовай дактарантуры ў Віленскай акадэміі працаваў у Нясвіжы, адначасова быў выхавацелем сыноў М. К. Радзівіла Рыбанькі і падарожнічаў з імі па Еўропе. У 1737—1749 гадах выдаў у Вільні 20 «Палітычных каляндарыкаў». Апошнія гады свайго жыцця працаваў над гісторыяй царквы ў Рэчы Паспалітай.

1929 год — нарадзілася (в. Старына Ушацкага раёна) Еўдакія Лось, беларуская паэтэса. Працавала ў Вучэбна-педагагічным выдавецтве Беларусі, у прэсе. Асноўныя матывы творчасці: услаўленне беларускага народа, яго працавітасці, лёс дзяцей у ваенныя і пасляваенныя гады, маральна-этычныя праблемы сучаснасці. Паэзіі Е. Лось уласцівы тонкі лірызм, шчырасць і непасрэднасць.

1939 год — нарадзіўся (в. Малая Слабада Клецкага раёна) Яўген Фёдаравіч Канапля, беларускі вучоны ў галіне біяхіміі і радыебіялогіі, член-карэспандэнт, акадэмік НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. У НДІ анкалогіі і медрадыялогіі распрацоўваў камбінаваныя метады тэрапіі раку, уключаючы прамянёвае лячэнне. З пачатковага этапу катастрофы на Чарнобыльскай АЭС вывучаў уплыў радыяцыі на метабалізм і найважнейшыя сістэмы арганізма. Гэта дазволіла распрацаваць канцэпцыю пражывання насельніцтва на радыеактыўна забруджаных тэрыторыях, пакладзеную ў аснову Дзяржаўнай праграмы пераадолення ў Беларусі наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

У свеце

1869 год — рускі вучоны Д. І. Мендзялееў склаў табліцу доследнай сістэмы элементаў, заснаванай на іх атамнай вазе і хімічным падабенстве. У 1871 годзе ён назваў яе перыядычнай.

1904 год — нарадзіўся Глен Мілер, вядомы амерыканскі джазавы музыкант, кіраўнік джаз-аркестра (створаны ў 1938 годзе).

Так гаварыў...

ПАЎЛА КАЭЛЬА:

«Часам трэба абысці ўвесь свет, каб зразумець, што скарб закапаны каля твайго ўласнага дома».

УСМІХНЕМСЯ

— Я не спраўлюся...
— Больш упэўненасці!
— Я ўпэўнены, што не спраўлюся!

Муж вяртаецца з камандзіроўкі, а дома — чужы мужык.

Муж пытаецца ў жонкі:

— А гэта хто?

— Сябар.

— Дарагая, ты, што, праўда, верыш у сяброўства паміж мужчынам і жанчынай?

— Вядома, веру.

— Божа, якая ж ты ў мяне яшчэ наіўная.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 10.899. Індэкс 63850. Зак. № 639. Нумар падпісаны ў 19.30 29 лютага 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12